Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 ВЕРАСНЯ 2016 г. СУБОТА № 170 (28280)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

XXIII ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА РАГАЧОЎ 2016

*Удзельнікам і гасцям урачыстасцей Дня беларускага пісьменства*

**Паважаныя сябры!**

Сардэчна віншую вас з Днём беларускага пісьменства.

У Год культуры яго правядзенне набывае асаблівае значэнне. Увага грамадства засяроджана на неабходнасці беражлівага захавання лепшых духоўных здабыткаў, якія дайшлі да нас праз стагоддзі, і ўзбагачэння нацыянальнай скарбніцы дасягненнямі нашых таленавітых сучаснікаў, бо гістарычная памяць і гонар за Радзіму служаць трывалым падмуркам для далейшага развіцця краіны.

Сёлета эстафету па правядзенні мерапрыемстваў прымае Рагачоў — горад, з якім звязаны лёсы Уладзіміра Караткевіча, Міхася Лынькова і Андрэя Макаёнка. Лейтматывам творчасці гэтых пісьменнікаў сталі любоў да роднай зямлі, павага да працавітых і добразычлівых людзей.

Упэўнены, багатая праграма свята паслужыць плённаму развіццю беларускага слова і пашырыць рады яго прыхільнікаў.

Жадаю ўдзельнікам і гасцям Дня беларускага пісьменства творчага натхнення, дабрабыту і поспехаў ва ўсіх справах.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КАРАГІН, старшыня прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва:**

*«Увядзенне інстытута самазанятасці будзе садзейнічаць развіццю дзелавой актыўнасці ў краіне. Навацыя дапаможа рэалізоўваць асабістую дзелавую ініцыятыву грамадзян, а значыць, дзяржава атрымае дадатковы прыбытак. Для самазанятасці могуць быць вызначаны дакладныя правілы работы на рынку, з'явяцца магчымасці самарэалізацыі з выхадам пры жаданні на больш складаны від дзейнасці — індывідуальнае прадпрымальніцтва або стварэнне кампаніі, гэта значыць на іншыя формы работы».*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 24° |
| Віцебск | + 21° |
| Гомель | + 23° |
| Гродна | + 22° |
| Магілёў | + 21° |
| Мінск | + 21° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 3.09.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9692 | ▲ |
| Еўра | 2,2028 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0299 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0738 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# СТАЛІЧНЫЯ ДАЛЯГЛЯДЫ

## Мінск захаваюць у існуючых межах і зробяць горад больш зручным для жыхароў



Фота БЕЛТА.

**Такі вынік праведзенага даклада Прэзідэнту аб перспектывах развіцця сталіцы і прылеглых тэрыторый Мінскай вобласці.**

Аляксандр Лукашэнка падрабязна цікавіўся горадабудаўнічымі планамі і напрацоўкамі, даў шэраг канкрэтных даручэнняў па актывізацыі тэмпаў будаўніцтва аб'ектаў, рацыянальным расходаванні сродкаў, навядзенні парадку на некаторых тэрыторыях.

Як далажылі Прэзідэнту, Мінскі гарвыканкам распрацаваў новы генеральны план горада. Ім, у прыватнасці, прадугледжваецца стабілізацыя колькасці насельніцтва сталіцы на ўзроўні 2 млн чалавек, захоўваюцца ўсе прыгарадныя сельгасугоддзі. «Гэта закон: на землі сельгаспрызначэння — там, дзе павінен расці хлеб, — вы не разлічвайце. Гэта правільна не толькі з пункту гледжання захавання зямлі. Мінск павінен быць прасторным сам па сабе і дыхаць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Плошча Мінска будзе ў асноўным захавана ў межах МКАД. Пры гэтым горадабудаўнікі разлічваюць на прырост насельніцтва да 2030 года ў колькасці 100-120 тыс. чалавек. У Мінску мяркуецца аптымізаваць аб'ёмы жыллёвага будаўніцтва, узвядзенне сацыяльна запатрабаванага жылля працягнецца на свабодных тэрыторыях.

СТАР. 2

# РАГАЧОЎ ЗАПРАШАЕ, ВІТАЕ, СВЯТКУЕ!

**Гэтыя выхадныя праходзяць у краіне пад знакам Дня беларускага пісьменства. Усяго ў праграму свята ўключана больш за 70 мерапрыемстваў.**







Фота БЕЛТА.

Жыхары Рагачова Сяргей ШЫШОЎ і Кацярына МІТКЕВІЧ.